УДК 65.01

# ТАЙМ-МЕНЕДЖМЕНТ ЯК МЕТАД ПРАФІЛАКТЫКІ ДЭЗАРГАНІЗАЦЫІ СУПРАЦОЎНІКАЎ ОУС

***У. В. Мельнікаў*** (Магілёўскі інстытут МУС РБ)
Навук. кір. ***С. В. Венідзіктаў***,
канд. філал. навук, дацэнт

Адна з асноўных задач тайм-менеджменту – дазволіць супрацоўніку паспець выканаць больш заданняў за абмежаваны час, дасягнуць пастаўленых службовых мэт. З аднаго боку, рашэнне гэтай задачы залежыць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ад агульнай сістэмы арганізацыі працы ў падраздзяленні, а з другога – асабіста ад супрацоўніка. Многія супрацоўнікі органаў унутраных спраў (ОУС) ігнаруюць тэхналогіі тайм-менеджменту як метаду высокай арганізацыі працы. Таму мы лічым, што навучанне асновам тайм-менеджменту мэтазгодна ўключаць у працэс службовай падрыхтоўкі.

Засваенне тэхналогій тайм-менеджменту супрацоўнікамі ОУС прадугледжвае рэалізацыю двух накірункаў: прафілактыка дэзарганізацыі і прафесійнага выгарання супрацоўнікаў; навучанне тэхналогіям і метадам тайм-менеджменту ў сістэме службовай падрыхтоўкі. Мяркуем, што ў межах прафілактыкі дэзарганізацыі кіраўніку ОУС мэтазгодна: (а) распрацаваць сістэму павышэння матывацыі супрацоўнікаў; (б) аптымізаваць змест службовых абавязкаў; (в) спланаваць парадак і сістэму кар’ернага росту; (г) палепшыць умовы працы; (д) прадухіліць узнікненне канфліктных сітуацый у калектыве.

Авалодаўшы навыкамі тайм-менеджменту, супрацоўнік не будзе пакутаваць ад пастаяннай стомленасці, дасягне пастаўленых мэт хутчэй, чым тыя, хто не знаёмы з паняццем тайм-менеджменту, за кароткі перыяд выканае неабходную працу і будзе, у цэлым, паспяховым спецыялістам. Дзякуючы тайм-менеджменту, кіраўнік ОУС можа вызначыць аптымальныя тэрміны выканання задач дзякуючы дадзеным аб індывідуальнай занятасці падначаленых. Таксама ён фарміруе ўпэўненасць у своечасовым выкананні без непасрэднага кантролю і стварае празрыстасць у працы супрацоўнікаў. Атрыманая такім чынам інфармацыя аб моцных і слабых баках самаарганізацыі супрацоўнікаў дазваляе прымаць рашэнні па ўдасканаленні метадаў кіравання ОУС [1].

**Літаратура**

1. Коричева, А. В. Возможности внедрения и использования технологий тайм-менеджмента в процессе планирования и расследования преступлений [Электронный ресурс] / А. В. Коричева, С. В. Тишков // Вопросы управления: электронный журнал. – 2018. – Режим доступа: http://vestnik.uapa.ru/ru/issue/2018/01/15/. – Дата доступа: 15.03.2020.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова